**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр. Пераможцаў, 11; 220004, г. Мінск
тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БІК: АКВВ BY 2Х; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр. Победителей, 11; 220004, г. Минск
тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
БИК: АКВВ BY 2Х; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

06.03.2024 № 02-02-22/2075
На № ________ от ________

Структурные подразделения областных и Минского городского исполнительных комитетов, осуществляющие государственно-властные полномочия в сфере культуры

Организации республиканского подчинения *(по списку)*

Творческие союзы *(по списку)*

О проведении конкурса

Министерством культуры в 2024 году проводится республиканский конкурс на создание произведений изобразительного искусства по государственному социально-творческому заказу (Инструкция о порядке организации и проведения конкурса прилагается).

Просим довести информацию о проведении конкурса до всех заинтересованных, в том числе путем размещения информации в глобальной компьютерной сети Интернет на официальных сайтах организаций и учреждений.

Приложение: на 11 л. в 1 экз.

Первый заместитель Министра В.И.Громада

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
ад 05.03.2024 № 43

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з артыкуламі 17 і 209 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 «О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий» і ўстанаўлівае агульны парадак арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

адраджэння, развіцця, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага выяўленчага мастацтва;

аздаблення творамі выяўленчага мастацтва інтэр’ераў грамадскіх будынкаў.

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства культуры, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь» (далей – НЦСМ).

Канкрэтныя тэрміны правядзення конкурсу вызначаюцца Міністэрствам культуры.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і павінна змяшчаць звесткі аб тэрмінах, умовах і парадку правядзення конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел прафесійныя мастакі, іншыя творчыя работнікі ў галіне выяўленчага мастацтва, якія маюць прафесійны сертыфікат творчага работніка, а таксама студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі ў галіне выяўленчага мастацтва (далей – удзельнікі конкурсу).

6. Конкурс праводзіцца ў мэтах стварэння 21 твора выяўленчага

мастацтва, прысвечанага 80-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры ў абласцях і г. Мінску (па тры ўстановы ў кожнай вобласці і г. Мінску).

На 2024 год у пералік устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры таксама ўключаюцца дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Целяханы» (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці), дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 імя Я.К.Цікоцкага» (г. Бабруйск Магілёўскай вобласці), дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 11 імя У.У.Алоўнікава г. Мінска» і дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 9 г. Мінска», так як створаныя ў 2023 годзе творы выяўленчага мастацтва для дадзеных устаноў па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу не рэкамендаваны Рэспубліканскай экспертнай камісіяй па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (далей – камісія) да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Пералік устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, памераў, прыкладнага зместу ствараемых у 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва дадаецца (Дадатак 1 да Інструкцыі).

7. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы этап з'яўляецца адборачным;

на другім этапе ствараюцца творы выяўленчага мастацтва і падводзяцца вынікі конкурсу.

8. На першым этапе ў перыяд з 6 сакавіка па 30 красавіка 2024 г. удзельнікі конкурсу накіроўваюць у НЦСМ па адрасе: 220040, г. Мінск, вул. Някрасава, 3:

заяўку на ўдзел у конкурсе па ўстаноўленай форме (Дадатак 2 да Інструкцыі);

эскіз твора выяўленчага мастацтва.

9. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктам 8 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

10. Выдаткі па стварэнні эскізаў аплачваюць удзельнікі конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння эскіза твора выяўленчага мастацтва.

11. Адбор эскізаў для далейшага стварэння твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу ў перыяд

з 1 па 20 мая 2024 г. ажыццяўляе камісія. На пасяджэнне камісіі могуць запрашацца прадстаўнікі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры.

Крытэрыямі адбору эскізаў з'яўляюцца:

адпаведнасць твора выяўленчага мастацтва прапанаванай тэматыцы, жанру, памеру і зместу;

высокі мастацкі ўзровень выканання.

12. Рашэнне аб адборы эскізаў прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

13. Спіс эскізаў, адабраных для стварэння твораў выяўленчага мастацтва, публікуецца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства культуры не пазней за пяць дзён пасля афармлення пратакола пасяджэння камісіі.

14. У перыяд з 21 мая па 20 жніўня 2024 г. удзельнікі другога этапу конкурсу ствараюць творы выяўленчага мастацтва ў адпаведнасці з эскізамі.

Выдаткі па стварэнні твораў выяўленчага мастацтва аплачваюць удзельнікі другога этапу конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам другога этапу конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння твора выяўленчага мастацтва.

15. У перыяд з 21 па 31 жніўня 2024 г. удзельнікі другога этапу конкурсу прадстаўляюць творы выяўленчага мастацтва ў НЦСМ.

16. У перыяд з 1 верасня па 1 кастрычніка 2024 г. камісія разглядае творы выяўленчага мастацтва і прымае рашэнне рэкамендаваць (або не рэкамендаваць) іх да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Рашэнне прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня

і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

17. Творы выяўленчага мастацтва набываюцца Міністэрствам культуры за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, і перадаюцца ўстановам дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

ПЕРАЛІК
устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры, памераў, прыкладнага зместу ствараемых у 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| **Брэсцкая вобласць** | | | |
| Баранавіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навамышская дзіцячая школа мастацтваў» | 42х59,4 см (фармат А2) | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – першыя крокі ў мірным жыцці малалетніх вязняў фашысцкіх канцлагераў |
| Іванаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Іванаўская дзіцячая школа мастацтваў імя Напалеона Орды» | 59,4х84,1 см (фармат А1) | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – першая сустрэча маці і сына, які вярнуўся з вайны |
| Івацэвіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Целяханы» | 50х70 см або 60х80 см | Сінтэз мастацтваў у кантэксце выяўленчага мастацтва і музыкі |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| Пружанскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў імя Р.Р.Шырмы г. Пружаны» | 42x59,4 см (фармат А2) | Карціна жыццесцвярджальнага характару: салдат (бацька, муж, сын) вярнуўся з вайны, сустракаецца са сваякамі. Вясна, вясковы пейзаж, яблыні ў квецені |
| **Віцебская вобласць** | | | |
| Бешанковіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Бешанковіцкая дзіцячая школа мастацтваў» | 200x300 см | Тэматыка – 1944 год. Аперацыя «Баграціён». Пераправа праз Заходнюю Дзвіну ў раёне г.п. Бешанковічы або ў раёне в. Узрэчча |
| Віцебскі раён | Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры «Бабініцкая дзіцячая школа мастацтваў» Віцебскага раёна | 100x100 см | Міхаіл Савіцкі «Віцебскія вароты» (1967) |
| Ушацкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ушацкая дзіцячая школа мастацтваў» | 100x100 см | «Прарыў. У нашай памяці навечна» (50-годдзю мемарыяльнага комплексу «Прарыў» прысвячаецца) |
| **Гомельская вобласць** | | | |
| Брагінскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Брагінская дзіцячая школа мастацтваў» | 180x120 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – фарсіраванне Дняпра |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| Добрушскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Добруша» | 150х120 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – пераможны май |
| Лельчыцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Лельчыцы імя М.П.Дрынеўскага» | 140х120 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – партызанскі край |
| **Гродзенская вобласць** | | | |
| г. Гродна | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гродзенская дзіцячая школа мастацтваў імя Антонія Тызенгаўза» | 100х80 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-я гадавіна вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |
| Зэльвенскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Зэльвенская дзіцячая школа мастацтваў» | 110х60 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-я гадавіна вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |
| Слонімскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Слонімская дзіцячая школа мастацтваў» | 200х130 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – 80-я гадавіна вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| **Магілёўская вобласць** | | | |
| г. Бабруйск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 імя Я.К.Цікоцкага» | 200x300 см або дыпціх ці трыпціх | Твор выяўленчага мастацтва можа быць выкананы алеем у сучасным стылі і адлюстроўваць напрамкі дзейнасці дзіцячай школы мастацтваў. Музычныя вобразы могуць быць умоўныя, у якасці фона магчыма выява гістарычнага Бабруйска, дапускаецца выкарыстанне дэкаратыўных элементаў |
| Глускі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Глуская дзіцячая школа мастацтваў імя В.К.Іванова» | 60x80 см | Пейзаж на песню «Бераг родны» народнага артыста Беларусі, кампазітара В.К.Іванова |
| Горацкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў і мастацкіх рамёстваў г. Горкі» | 60x80 см | Плошча Якубоўскага г.Горкі з адлюстраваннем бюста І.І.Якубоўскага, двойчы Героя Савецкага Саюза, маршала СССР, ураджэнца в. Зайцава Горацкага раёна. Цэнтральнае месца на плошчы займае Алея Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы |
| Дрыбінскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дрыбінская дзіцячая школа мастацтваў» | 60x80 см | 46-ы гвардзейскі начны бамбардзіровачны авіяцыйны Таманскі Чырвонасцяжны ордэна Суворава полк, вядомы ў гады Вялікай Айчыннай |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| | | | вайны як «Начныя ведзьмы» – жаночы авіяцыйны полк у складзе Ваенна-Паветраных Сіл СССР |
| **Мінская вобласць** | | | |
| Любанскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Любанская дзіцячая школа мастацтваў» | 50х70 см | Партрэт І.А.Муравейкі (1921-2021), беларускага паэта, пісьменніка, заслужанага работніка культуры БССР (1982), франтавіка, ганаровага члена Саюза пісьменнікаў, ганаровага грамадзяніна горада Любані |
| Мінскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Заслаўская дзіцячая школа мастацтваў» | 100х80 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – наш абавязак – памятаць |
| Стаўбцоўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Стаўбцоўская дзіцячая школа мастацтваў» | 50х70 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – успамін падзей ваеннага часу |
| **г. Мінск** | | | |
| г. Мінск (Маскоўскі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 г. Мінска» | 80х115 см (гарызантальны) | Выява дзіцяці з мальбертам, які малюе горад Мінск... Вясёлка над вадой… Уся гэтая прыгажосць ужо перададзена юным мастаком, праца амаль скончана. Розніца з рэальнасцю толькі ў адным – на малюнку |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора выяўленчага мастацтва | Прыкладны змест твора выяўленчага мастацтва |
|---|---|---|---|
| | | | хлопчыка па вясёлцы ў неба сыходзяць салдаты з рэчмяшкамі і вінтоўкамі за плячыма. |
| г. Мінск (Маскоўскі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 11 імя У.У.Алоўнікава г. Мінска» | 160x140 см | Дзіцячы хор (для размяшчэння ў харавым класе) |
| г. Мінск (Першамайскі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 9 г. Мінска» | 100x200 см | Сімбіёз відаў мастацтва |
| г. Мінск (Савецкі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 8 імя Р.Р.Шырмы г. Мінска» | 160x120 см | Тэматыка твора выяўленчага мастацтва – адраджэнне пасляваеннага Мінска |
| г. Мінск (Фрунзенскі раён) | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 19 г. Мінска» | 100x70 см | Канцэрт у прыфрантавой зоне або канцэрт у Дзень Перамогі ў вызваленым населеным пункце. Удзельнікі канцэрта: музыкі са скрыпкай і баянам, ці трыо струннае, ці спявачка з баянам (акадэмічнае мастацтва) |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

Форма

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

______________________________________

______________________________________
(прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) аўтара

______________________________________
(кантактны тэлефон)

# ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2024 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры.

Паведамляю, што з'яўляюся аўтарам эскіза, які прадстаўлены мной для разгляду на конкурсе.

З умовамі конкурсу азнаёмлены і згодны.

| | | |
|---|---|---|
| ____________________ | ______________________ | ______________ |
| (ініцыялы, прозвішча аўтара) | (подпіс) | ( дата) |